Пра кожнага са зніклых відаў птушак можна было б напісаць больш ці менш падрабязны і сумны расповед, аднак найбольш дзіўная гісторыя знікнення біялагічнага віду, на мой погляд, адбылася з новазеландскім крапіўнікам з вострава Стывенс.


Востраў Стывенс знаходзіцца ў праліве Кука, які аддзяляе Паўночны і Паўднёвы астравы Новай Зеландыі і ўяўляе сабой атол са скальнай пароды плошчай 2,6 км^2, якая да 300 м узнеслася над навакольнай марской вадой.

Гэты невялічкі кавалак зямлі на некалькі месяцаў напрыканцы XIX ст. прыцягнуў увагу натуралістаў амаль з усяго свету адкрыцццём там невялічкай птушкі, якая знікла так хутка пасля гэтага, што амаль нічога невядома пра яе лад жыцця.

Чатыры галоўныя аспекты робяць гэту гісторыю незвычайнай. Па-першае, крапіўнік з вострава Стывенс меў самы малы арэал, які вядомы для птушак. Па-другое, гэта адзіны вядомы дагэтуль нелятаючы від сярод вераб'іных, які дажыў да прыжыццёвага апісання. Па трэцяе – два знакамітых тагачасных арнітолага незалежна апісалі новы від, і гэта выклікала бурныя спрэчкі наконт прыярытэту і яго навукой назвы. І, нарэшце, чацвёртае: і да яго навуковага адкрыцця, і да поўнага вынішчэння мае адносіны толькі адна істота – кот наглядчыка маяка, які быў збудаваны на востраве ў пачатку 1890-х гадоў.

Жарсці прыярытэту

Інтрыга, якая адбылася з апісаннем новага віду птушак, разгарэлася паступова, але так і не змагла згаснуць ажно да смерці аднаго з яе ўдзельнікаў, бо закранала гонар і пачуцці двух асоб – арнітолагаў Уальтэра Балера і Уальтэра Ротшыльда.



Уальтэр Балер

Сэр Уальтэр Лаўры Балер (Walter Lawry Buller) (1838–1906) быў першым ураджэнцам Новай Зеландыі, які стаў шырока вядомым навукоўцам-арнітолагам. Ён дасягнуў гэтага дзякуючы сваёй здольнасці да мовы новазеландскіх абарыгенаў (маоры), амбіцыям, працы і бессаромнасці ў юнацкія гады.

Са школьнай парты ён зацікавіўся навакольнай прыродай і асабліва птушкамі. Ён шмат чытаў пра метады тагачасных навуковых даследаванняў птушак і неўзабаве стаў страляць іх, каб сабраць уласную калекцыю скурак. У 1857 г., яшчэ не напісаўшы ніводнага навуковага артыкула, Балер прапанаваў сябе Лонданскаму Лінэеўскаму таварыству ў якасці правадзейнага чальца. Наймаладзейшыя чальцы таварыства мусілі мець 21 год, таму Балер прамаўчаў пра тое, што яму яшчэ толькі 19... Да 1870 г. ён сабраў дастаткова матэрыялу, каб падрыхтаваць да друку сваю самую вядомую кнігу – *A History of the Birds of New Zealand (Гісторыя птушак Новай Зеландыі)*, для чаго ўпершыню наведаў Вялікабрытанію. Кніга выйшла ў Лондане ў 1872-73 гг. як чатырохтомнае выданне, аздобленае шыкоўнымі, уручную расфарбаванымі літаграфіямі мастака Дж.Г. Кеўлеманса (JG Keulemans). Гэтая праца была заўважаная нават каралевай Вікторыяй, з рук якой Балер атрымаў ордэн Святога Майкла і Георга (CMG).

Ён шмат публікаваўся ў розных навуковых выданнях, асабліва ў *Transactions of the New Zealand Institute*, аднак заўсёды хацеў быць заўважаны ў метраполіі. У 1888 г. ён вярнуўся ў Лондан, каб апублікаваць другое, перапрацаванае выданне сваёй «Гісторыі...». За яго і іншыя заслугі ён быў прыняты ў рыцарскі стан і атрымаў прыдомак «сэр» перад імем і прозвішчам.

У наступным годзе Балер назаўсёды перабіраецца ў Англію, дзе, сумуючы па радзіме, ў 1905 г. друкуе «Дадаткі да птушак Новай Зеландыі». Гэтая кніга стала яго апошняй навуковай публікацыяй.



Уальтэр Ротшыльд

Лорд Уальтэр Ротшыльд (Walter Rothschild) (1868-1937) нарадзіўся ў знакамітай сям'і патомных банкіраў. Будучы выдатны заолаг і палітык, напэўна, адзін з самых багатых людзей свайго часу, з ранняга дзяцінства захапляўся ўсімі жывымі істотамі навокал сябе. Пасля першага наведвання цырку ва ўзросце 7 год ён заявіў бацькам, што будзе збіраць жывёлаў з усяго свету і пабудуе для гэтага ўласны музей. Ён ніколі не адмовіўся ад гэтай мары і зрабіў усё магчымае, каб яе ажыццявіць. Яго калекцыя пастунова павялічвалася, ён нават праслухаў курс заалогіі ў Кембрыджы, аднак бацька вырашыў зрабіць з яго банкіра. Дзесяць год, з 21 да 31 гады, Уальтэр праводзіў усе працоўныя дні ў банку бацькі, але невядома ніякіх папер ці дамоваў, якія б ён падпісаў там за гэты час.

Нарэшце, бацькі зразумелі марнасць прымусу, і з гэтага часу пачынаецца росквіт навуковай кар'еры Уальтэра Ротшыльда. Разам са сваімі супрацоўнікамі ён апісаў каля 5 тысяч новых відаў жывёл, напісаў прыкладна 1200 навуковых артыкулаў і кніг. У многім да гэтага спрычыніліся яго грошы і экспедыцыі (уласныя і тыя, якія ён фундаваў) і калекцыі, бо для некаторых новых відаў менавіта ў яго захоўваліся першыя, апошнія і адзіныя вядомыя экземпляры. У сваім маёнтку ў Трынгу Уальтэр узвёў вялізны будынак і там стварыў самы вялікі прыватны заалагічны музей у свеце, у якім захоўваліся каля 300 тысяч скурак птушак, 200 тысяч птушыных яек, 2 мільёны 250 тысяч матылёў і каля 30 тысяч жукоў.


Ён літаральна перавярнуў тагачасныя ўяўленні пра разнастайнасць жывёльнага свету. Яго імем названыя 153 розных таксонаў насякомых, 58 птушак, 18 звяроў, 3 віды рыб і павукоў, 2 рэптылій і па аднаму віду мнаганожак і чарвякоў.



Будынак былога Заалгічнага музея У.Ротшыльда ў Трынгу/ здымак з www.geograph.org.uk



Адзін з малюнкаў крапіўніка з вострава Стывенс, зроблены Дж.Кеўлемансам.



Перавыданне знакамітай кнігі Балера, зробленае у 2012 г.



Так выглядае тое, што засталося ад цэлага біялагічнага віду: пудзіла і скурка крапіўніка Стывенса ў адным з музеяў. Здымак з www.ryanphotographic.com

У. Ротшыльд так тлумачыў свой прыярытэт у апісанні новага віду птушак з вострава Стывенс:

«Я атрымаў 9 асобін гэтай новай птушкі і не непакоіўся пра тое, ці не атрымалі яе іншыя ў той самы час. Праз тое, што я не мог прыбыць на снежаньскую, 1894 года, сустрэчу Брытанскага арнiталагiчнага клуба, я папрасіў д-ра Хэртэрта паказаць птушак ад майго імя. Калі ён так зрабіў і прачытаў іх апісанне, Старшыня, д-р П.Л. Склэтэр сказаў, што птушка таксама атрымана для ілюстрацыі і апісання ў /часопісе/ «Ibis» ад сэра Ультэра Балера і спытаў д-ра Хэртэрта, ці не хачу я адклікаць сваё апісанне. Д-р Хэртэрт сказаў, што гэта нечаканая і непрыемная сітуацыя, але ён не мае паўнамоцтваў адклікаць маё апісанне, і што ён і д-р Шэйрп думаюць, што справаздача сустрэчы павінна быць надрукаваная без уліку любых матэрыялаў, якія могуць адносіцца да той жа птушкі. Несумненна, што гэта можна прызнаць няўдачай сэра Ўальтэра Балера, але такой самай няўдачай гэта стала б і для мяне – калі б ён апярэдзіў мяне… Ён меў толькі адзін экзэмпляр, я меў дзевяць і абодвух палоў, і я заплаціў добрыя грошы за іх як за птушку новага віду. Мае птушкі /знаходзяцца/ ў Трынгу, і, як кожны ведае, могуць быць дследаваныя любым кампетэнтным арнітолагам, тады як птушка Балера не знаходзіцца ні ў адным з музеяў і не зразумела, каму яна была прададзена ў рэшце рэшт…

Я паведамляю пра гэтыя неістотныя дэталі таму, што Балер хутчэй горка і некалькі разоў наракаў на маё апісанне крапіўніка з вострава Стывенс на старонцы 111 яго «Дадаткаў» /да першага выдання «Гісторыі птушак Новай Зеландыі»/. Я магу толькі дадаць, што, канешне, мая назва, апублікаваная ў снежні 1894 г., мае прыярытэт перад яго, якая не была апублікаваная да красавіка 1895 г.».

А вось што пісаў У. Балер пра гэтую сітуацыю ў «Дадатках»:

«Маё апісанне… з'явілася ў /часопісе/ «Ibis» у 1895 г. на старонках 236-7 разам з прыгожай устаўкай /з выявай віду/ пяра м-ра Кеўлеманса. На жаль, падрыхтоўка гэтай устаўкі адклала апублікаванне маёй працы на тры месяцы, і ў гэты час м-р Ротшыльд атрымаў птушку ад м-ра Генры Трэверса. Апісанне /новага віду/ м-ра Ротшыльда як Traversia lyalli з'явілася ў тым самым нумары «Ibis'а», але на старонках 268-269. Аднак, тым не менш, яно было анансаванае у «Бюлетэні Брытанскага арнiталагiчнага клуба», які выйшаў 29 снежня 1894… Я маю ліст аднаго з рэдактараў, д-ра Склэтэра (датаваны 7 красавіка 1896 г.), у якім ён інфармуе мяне, што казаў м-ру Ротшыльду, што я ўжо апісаў птушку і спрабаваў адгаварыць яго рабіць тое, што ён лічыць нячэсным… Нягледзячы на любыя фармальныя канструкцыі, паводле правілаў наменклатуры, я лічу, што праўда на маім баку ў гэтых абставінах і арыгінальнае навуковае імя належыць да мяне, і пакідаю права рашэння за арнітолагамі, якія ведаюць факты, вырашыць, выкарыстоўваць яго або не».

Як знік крапіўнік з вострава Стывенс

Дэвід Лайал, наглядчык маяка, быў адзіным жыхаром вострава Стывенс і натуралістам-аматарам. Таму ў 1894 годзе ён перадаў тых 11 птушак, якіх час ад часу мёртвымі прыносіў яму кот, новазеландскаму навукоўцу Генры Траверсу, а той, у сваю чаргу, 10 з іх пераслаў Ультэру Ротшыльду ў Лондан і адну – мясцоваму арнітолагу Ўальтэру Балеру. Невядома, колькі ўсяго крапіўнікаў кот з'еў і прынёс свайму гаспадару, але праз некаторы час Балер атрымаў яшчэ 5 птушак. Таму мінімальная лічба вядомых птушак, якія жылі на востраве, толькі 16!

Усё, што вядома пра жыццё крапіўніка з вострава Стывенс, мы ведаем са словаў наглядчыка маяка, які быў першым і апошнім чалавекам, які бачыў прадстаўнікоў віду пры жыцці. Падчас двух сустрэчаў з крапіўнікамі, якія адбыліся ўвечары, яны вельмі хутка перабягалі паміж кавалкамі скалаў і хаваліся там. Таму лічыцца, што птушачкі мелі прыцемкавую актыўнасць і харчаваліся (як і іх бліжэйшыя крэўныя – іншыя новазеландскія крапіўнікі) пераважна насякомымі. Як і ў іншых прадстаўнікоў сямейства, самкі былі трошкі большыя за самцоў і мелі нязначныя адрозненні ў афарбоўцы пер'я, птушкі абодвух палоў мелі вельмі кароткі хвосцік і кароткія акруглыя крыльцы. Даўжыня цела дасягала 10 см,

дзюба – 14 мм, крылы – 46-49 мм, хвост – 17- 21 мм, цэўка – 19 мм.

Экалагічная ніша дробных грызуноў вельмі пасавала гэтаму віду, а невялікая колькасць і абмежаваная тэрыторыя распаўсюджання са страчанай здольнасцю да палёту прывялі да таго, што адзіны драпежнік на востраве – кот – змог знішчыць увесь від за лічаныя месяцы.

Скуркі і пудзілы тых некалькі птушак, якіх кот Ціблс прынёс свайму гаспадару, цяпер знаходзяцца ў музеях Лондану, Крыстчарча (Новая Зеландыя), Нью Ёрка, Пітсбурга і Кембрыджа (ЗША)...

Праз непрацяглы час пасля таго, як знікненне толькі што апісанага віду стала фактам, у адной з брытанскіх газет з'явіўся артыкул, прысвечаны падзеям вакол лёсу крапіўніка з вострава Стывенс з вельмі красамоўным заканчэннем-прапановай: *«І мы не маем сумневаў, што будзе вельмі добра, калі Марскі дэпартамент не будзе дазваляць браць з сабой катоў наглядчыкам маякоў, калі яны пасылаюцца на ізаляваныя астравы, дзе цікавыя прадстаўнікі мясцовай фаўны вядомыя або могуць жыць, нават калі трэба будзе закупіць мышалоўкі за дзяржаўныя грошы».*

Крэўныя і браты па няшчасцю

У рэшце рэшт назва віду ў гонар яго першаадкрывальніка – наглядчыка маяка, прапанаваная Ротшыльдам – *Traversia lyalli* – была прызнаная першай, таму назва, прапанаваная Балерам – *Xenicus insularis* – больш не выкарыстоўваецца. Правілы заалагічнай наменклатуры не могуць змяняцца нават у такіх немаральных выпадках. Аднак прапанаваны Ротшыльдам для новага віду асобны род Traversia (у гонар Г. Траверса, які прадаў яму птушак) быў прызнаны штучным, і цяпер для крапіўніка з вострава Стывенс выкарыстоўваецца назва *Xenicus lyalli.* На Паўночным і Паўднёвым (галоўных астравах Новай Зеландыі) і меншых астраўках вакол іх у гістарычны час сустракаліся яшчэ 6 відаў асобнага сямейства Новазеландскіх крапіўнікаў Acanthisittidae, прычым назва «крапіўнікі» для гэтых птушак вельмі ўмоўная і звязана толькі з іх знешнім падабенствам да сапраўдных крапіўнікаў з Еўразіі і Паўночнай Амерыкі.

Сямейства гэтае эндэмічнае для Новай Зеландыі і вельмі старажытнае па свайму паходжанню, з узростам не менш за 50 мільёнаў гадоў асобнай эвалюцыі. Апошнія даследаванні сведчаць пра тое, што блізкіх крэўных гэтых птушак сярод сучасных таксонаў не існуе, і яны ўяўляюць вельмі адасобленую лінію развіцця ў атрадзе вераб'інападобных.

Тры віды новазеландскіх крапіў-нікаў (хутчэй за ўсё, яны, як і крапіўнік з вострава Стывенс, таксама неляталі) зніклі пасля прыбыцця на астравы продкаў маоры. Яшчэ два віды: прадстаўлены ў артыкуле і хмызняковы новазеландскі крапіўнік – зніклі пасля прыбыцця на Новую Зеландыю еўрапейцаў з-за інтрадукаваных апошнімі жывёл, прычым хмызняковы крапіўнік сустракаўся нават да 1972 года. З двух пазасталых так званы крапіўнік-стралец шырока распаўсюджаны на абодвух асноўных астравах, а новазеландскі горны крапіўнік насяляе толькі горныя раёны Паўднёвага вострава і параўнальна рэдкі.

Завочнае прымірэнне

12 кастрычніка 2012 года адбылася падзея, якая хаця б пасмяротна магла б прымірыць паміж сабой Ротшыльда і Балера: у новазеландскім выдавецтве выйшла шыкоўнае перавыданне знакамітай кнігі апошняга *A history of the birds of New Zealand* («Гісторыя птушак Новай Зеландыі»), якая ўпершыню ўбачыла свет яшчэ ў 1872-73 гг. Джэф Норман, які найбольш спрычыніўся да гэтай падзеі, прызнаў, што ідэя аб неабходнасці перавыдання гэтай кнігі прыйшла яму ў Трынгу, – былым фарпосце У. Ротшыльда, дзе цяпер знаходзіцца Арніталагічны аддзел Брытанскага музея натуральнай гісторыі. Менавіта тут Норман убачыў арыгінальныя акварэлі з выявамі птушак Новай Зеландыі Джона Джэрарда Кеўлеманса, знакамітага галандскага мастака, які, між іншым, праілюстраваў усе кнігі Балера.

Дзякую Яўгенію Шэргаліну (Вялікабрытанія) за дапамогу ў стварэнні артыкула.



Так маглі выглядаць крапіўнікі пры жыцці. Малюнак сучаснага мастака Flannery T. Schouten з www.dww.no-ip.org

Зимовка гаршнепа в Беларуси

Валерий Юрко, Андрей Нестеров
Фото Андрея Нестерова
Больше снимков к статье можно посмотреть на сайте www.birdwatch.by



Для Беларуси гаршнеп – редкий гнездящийся вид околоводных птиц, а встретить его здесь на зимовке – настоящее событие. До сих пор были известны только две регистрации в зимний период: 30 января 1966 года на реке Волма в Воложинском районе и в начале января 1982 года в городе Витебске. В последние годы отмечены случаи зимовки гаршнепа и на Брестчине.

В Минске гаршнеп зимой впервые был обнаружен в 2010 году около Минской станции аэрации на ручье, впадающем в Свислочь. Как всегда, помог случай. Хотя, как сказал классик, «случайности не случайны». Все закономерно. Но обо всем по порядку.

На том ручье всю зиму держался крапивник. Мы с моим другом Андреем Нестеровым довольно часто и подолгу его фотографировали.

Однажды, когда Андрей уже ушел, сидя в одиночестве в сумерках, я заметил, как ручей перебежало какое-то животное. Решил, что это крыса, и не придал этому значения. Затем увидел, что эта «крыса» идет по воде вдоль берега, все время наклоняя голову. Только тогда понял, что это птица, и, по-видимому, не рядовая, а как раз та, встретить которую мечтал давно. Она собирала вдоль берега пищу, при этом постоянно покачивалась вверх-вниз, как поплавок. Вероятно, таким образом она заставляла всплывать к поверхности различных донных беспозвоночных либо попросту разминала затекшие ноги. Встречая на своем пути глубокие места, гаршнеп (а в том, что это именно он, я уже не сомневался) либо переплывал, либо перепрыгивал их.

За три дня наблюдений в январе 2010 года гаршнеп появлялся в одном и том же месте после пятнадцати часов, когда уже опускались сумерки. Вероятно, под склоненными к воде заснеженными кустами серой ивы он и проводил дневное время. За эти дни в сумерках с помощью фотовспышки мне удалось сделать всего пару снимков низкого качества.

Позже, уже в один из февральских дней, на том же месте, где раньше прятался гаршнеп, после захода солнца из-под куста доносились характерные звуки его токовой песни. Она была неполной и состояла лишь из однообразных слогов «кер-р-р-р», «кер-р-р-р», «кер-р-р-р», напоминающих крики лягушки. Это продолжалось около трех минут, затем минутная пауза – и песня повторилась снова.

Следующей зимой, в начале декабря 2010 года, после сильных снегопадов и морозов гаршнеп был обнаружен неподалеку от зоопарка на небольшом затоне реки Свислочь. Вспугнутая птица отлетела от меня метров на двадцать и села в заснеженную осоку. После повторного беспокойства она улетела далеко вниз по реке.

О том, чтобы сфотографировать ее, не могло быть и речи, так как пока не удавалось даже толком рассмотреть эту неуловимую птицу в бинокль: гаршнеп «держал дистанцию». И тут очень кстати пришелся подаренный другом маскировочный халат и миниатюрный фонарик. Настали вечера усиленных поисков, и наконец мне удалось зафиксировать эту «синюю птицу». Гаршнеп кормился на мелководье в абсолютно чистой воде, в свете фонаря хорошо были видны пальцы на его ла-

пах. Сделав несколько снимков сверху, я отполз по снегу в сторону и вниз, чтобы поменять ракурс, а когда посмотрел на то место, где только что был гаршнеп, то его и след простыл.

Ни дневные, ни вечерние поиски больше не давали результатов, хоть мы с другом и желали этого всей душой. Лишь в начале января 2011 года гаршнеп снова был обнаружен в Шабанах на протоке Свислочи. Мы возобновили поиски, но больше птица на глаза не попадалась. Как сквозь землю провалилась.

В 2012 году настоящая морозная зима началась лишь во второй половине января. Вернувшись после очередной вахты из заповедника в Минск, следующим утром схватил болотные сапоги, рюкзак и фотокамеру и буквально помчался на Свислочь. Методично прочесывал речные берега с небольшими затонами в поисках зимующего гаршнепа. Помогал накопившийся за две прошедшие зимы опыт, появились знания о том, что нужно этой редкой птице для нормальной зимовки. И вновь повезло. Гаршнеп был обнаружен недалеко от старого места на небольшом затончике Свислочи около зоопарка. Я приблизился к нему метров на 10, как он заметил меня и тут же улетел в сторону плотины Чижовского водохранилища. Но главная цель была достигнута: птица обнаружена, она снова зимует! Это обстоятельство радовало и окрыляло одновременно. «Остальное уже будет делом техники и хорошей погоды», – думал я.

Наконец наступил день, когда удача повернулась лицом и к моему другу. Поддавшись своей интуиции, он уговорил меня проверить ручей, впадающий в Чижовское водохранилище, где когда-то мы фотографировали зимой пастушка. Глядя в бинокль, Андрей полушутя-полусерьезно спросил: «Это такая небольшая птица с желтыми полосками на спине?» «Ага», – ответил я ему в тон. «Ну вон, сидит твой гаршнеп на правом берегу в снегу», – указал улыбаясь Андрей, и протянул бинокль. «Не разыгрывай», – с этими словами недоверчиво я взял у него бинокль и глянул на указанное место. Гаршнеп сидел, нет, скорее лежал головой в противоположную сторону от нас. В бинокль хорошо было видно, что птица пристально наблюдает за людьми, благодаря характерному расположению глаз, позволяющему гаршнепам (и не только им) следить за тем, что происходит у них сзади. Обзор на 360°! Пожалуй, это даже лучше, чем у сов: нет необходимости поворачивать голову.

Мы стали окружать гаршнепа, заранее накинув на себя белое маскировочное облачение. Однако птице почему-то не понравился наш «прикид», и мы остались без объекта съемки.

Побродив по окрестностям в поисках какой-нибудь другой фотомодели и не найдя ничего приличней торчащей из речки обледеневшей трубы, мы вернулись на прежнее место к ручью. Все наши мысли и разговоры постоянно вертелись только вокруг гаршнепа. На этот раз гаршнеп не только порадовал нас своим присутствием, но и позволил приблизиться поближе. Из-за сильного мороза от воды поднимался пар, который в контровом солнечном свете был хорошо заметен на снимках. Справиться с этим не помогала даже фотовспышка. С противоположной стороны сфотографировать птицу не позволял хорошо укрывавший ее снежный сугроб. При нашем приближении гаршнеп затаивался и не менял положения своего тела около двадцати минут, лишь очень медленно приподнимал голову, полностью доставая клюв из воды. Мы решили отложить съемку до завтрашнего дня, надеясь найти птицу в более выгодном для съемки месте.

На следующий день морозы ослабли и гаршнеп снова перелетел на речку, берега которой во многих местах были свободны ото льда. Мне удалось отыскать гаршнепа неподалеку от Минской станции аэрации в небольшой промоине на берегу Свислочи. Птица, заметив человека, тут же улетела вниз по реке. Вероятно, что на участке Свислочи от Чижовского водохранилища до деревни Королищевичи проводят зиму не один, а как минимум два-три гаршнепа.





Белые аисты – соседи гаршнепа по зимовке в Минске.

Побродив по окрестностям около часа, мы вернулись, и обнаружили птицу на соседнем, совсем крохотном ручейке. Гаршнеп стоял в воде под сухим облиственным стеблем осота, так что сверху его увидеть было затруднительно, настолько он сливался с окружающим фоном.

Мы начали фотосъемку, постепенно приближаясь к гаршнепу. Удалось подползти к нему на два метра и снимать, как хотелось. Вероятно, птица была сыта, так как все время стояла на одном месте, как будто грелась на солнышке. В зависимости от нашего поведения она то припадала брюхом к воде, опустив в нее клюв, то приподнималась и осматривалась по сторонам, то топорщила перья, увеличивая тем самым свои габариты. Солнечная ванна ему явно очень нравилась. Мы провели около гаршнепа, лежа и сидя в снегу, два с половиной часа, а он и не думал что-либо предпринимать.

Хроника одной экспедиции

Павел Пинчук.
Фото автора



Моя история знакомства с лопатнем началась со звонка Александра Винчевского зимой 2008 года. Требовались орнитологи в две экспедиции на Чукотку: первая по лопатню на два с половиной месяца, вторая по пискульке на месяц-полтора. Не раздумывая, выбрал первую – и в конце мая, совершив почти 9-часовой перелет из Москвы в Анадырь, попал из белорусского лета в чукотскую весну, больше похожую на зиму.

В начале июня весна на Чукотке еще только начиналась, по льду Анадырского залива ездили вездеходы, но весенняя миграция птиц уже была в самом разгаре. Первую неделю мы провели в поселке Угольные Копи, ожидая вертолет. Чтобы убить время (и не только), поставил паутинные сети – первый день ловил те же виды, что неделю назад были на Припяти: фифи, галстучник, бекас, турухтан. И только на следующий день пополнил свой список длиннопалым песочником.

Вообще ожидание вертолета оказалось весьма утомительной процедурой: каждое утро к девяти часам нужно было полностью собраться и приехать в аэропорт, где через час-полтора услышать, что рейс отменен из-за сложных погодных условий. Погода, однако, быстро сжалилась над нами – и через неделю мы вылетели в поселок с труднопроизносимым названием Мейнопыльгино. Садясь в вертолет, впервые столкнулся с особым отношением к орнитологам: летчики, узнав, кто мы такие, разрешили открывать иллюминатор в полете для фотографирования. Позже я перестал удивляться тому, что орнитологам всюду давали зеленый свет, например, свободно разрешали пользоваться интернетом в школах или приобретать взрослые напитки в «комендантский час».

Задача была довольно простой – на мониторинговой площадке найти и закартировать все гнездящиеся пары лопатня, по возможности найти гнезда и проследить их судьбу. От кольцевания лопатней к тому времени уже отказались, но необходимо было искать птиц, помеченных цветными кольцами в предыдущие годы. Кроме того, в нашу работу входило общение с местным населением и организация «Клуба друзей лопатня». Помимо работ по лопатню предстояло провести учеты птиц на морских базарах на юго-востоке Чукотки.

Лопатня мы увидели в первый же день после прилета, довольно близко от поселка. Зная о том, что лопатень не самый крупный кулик, все-таки удивился его размерам. Не больше кулика-воробья. Рассмотреть его в тундре весьма непросто, тем более что он не всегда спешит показаться. Спасает голос, характерное «жужжание».

По окраске и внешнему виду лопатень мало чем отличается от привычного кулика-воробья, еще больше похож он на обычного в этих местах песочника-красношейку. Но вот что касается клюва, то это отдельная тема. Не совсем понятно, для чего он ему нужен именно такой формы. При наблюдениях за кормовым поведением этого куличка сложилось впечатление, что такая форма скорее мешает, чем помогает. Кстати, в процессе подготовки презентации для местной школы выяснилось, что

название лопатню дали из-за сходства вовсе не с лопатой, а с «лопатнем» – специальным сверлом, которое предназначалось для ручного высверливания отверстий под деревянную ось телеги в ступице колеса.

Но вернемся к работе, для которой мы, собственно, и приехали. Результаты наших учетов показали дальнейшее падение численности лопатня. На площади, где в 2003 году отмечалось почти 100 пар лопатней, обитало не более 10 пар. Всего мы нашли 6 гнезд, из которых одно, скорее всего, съели собаки, а в остальных нормально вывелись птенцы.

Следует сказать, что погода не благоприятствовала ни самим лопатням, ни нашей работе. В начале июня прошли небольшие снегопады, после которых снег таял в течение нескольких часов. Июнь был умеренно холодным, средняя дневная температура составляла около 5 градусов. Дождей было мало, да и те, которые шли, чаще напоминали морось. В первой половине июля ясный теплый день был всего один, в остальные дни стояла облачная прохладная погода. Все это привело к тому, что участки, на которых обычно гнездились лопатни, оказались пересушенными. Скорее всего, это и повлияло на низкую численность лопатней, подтверждение этому было получено в следующем году.

Если гнездо лопатня найти трудно, то птенцов еще сложнее. Зная точное местонахождение гнезда и периодически контролируя его, мы потратили полчаса на то, чтобы найти недавно выведшихся птенцов, которые лежали недалеко от гнезда. У только что появившегося на свет птенца лопатня на коротком клюве уже есть вполне солидная «лопатка», которая по мере роста клюва будет отодвигаться все дальше от головы.

В середине июля мы на две недели покинули поселок для проведения учетов на морских базарах. Кроме учетов колониальных птиц, обследовали также участок реки Пика в надежде найти гнездящихся лопатней, но безрезультатно. Своеобразной компенсацией являлось довольно близкое общение с бурыми медведями. Надо сказать, что человека они боятся, но не сильно. А близкое соседство колонии моржей и идущая на нерест красная рыба (нерка и горбуша) приводили к тому, что одновременно мы могли видеть до семи медведей. Кончилось это все тем, что один из медведей (которому мы дали нецензурную кличку) распорол нашу резиновую лодку, видно, перепутав ее с мертвым моржом.

По возвращении в поселок нас ждало неприятное известие о том, что мест в вертолете для нас нет и не будет. Поэтому окончание сезона оказалось смазанным постоянным ожиданием известий: заберут или не заберут. В последние дни мы совершали недальние вылазки, целью которых было кольцевание птенцов. Из двух известных пар исландского песочника удалось окольцевать трех птенцов и сфотографировать самца с белым флагом, означавшим, что окольцован он был на зимовке в Новой Зеландии.

Один из последних выходов мы потратили на то, чтобы навестить наших окольцованных птенцов. Самих птенцов на этот раз мы так и не увидели: они ушли в траву. Но по поведению родителей было видно, что им есть кого охранять. Так что хотя бы для этих птенцов начало жизни получилось удачным.

Ну а по возвращении в августе в Москву нас ждали известия о начавшейся войне с Грузией и огромное количество милиции на всех вокзалах столицы нашей бывшей родины.

Теперь, оглядываясь назад, вспоминаю, что тогда, в 2008 году, сразу после окончания сезона, будущее лопатня виделось в мрачных тонах. Были даже мнения, что через 5-10 лет он вымрет окончательно и предпринимать что-то уже поздно. Однако работы, проведенные в последние два года, позволяют смотреть на будущее этого уникального кулика с определенным оптимизмом (если тут уместно это слово).








Апошняя надзея для кузена дронта

Эндэмік Самоа зубадзюбы голуб *(Didunculus strigirostris)*, адзін з найбольш блізкіх да вымерлага дронта сучасны від птушак, хутчэй за ўсё таксама знік. Адмыслова арганізаваная на яго пошукі экспедыцыя не змагла адзначыць ніводнай птушкі.

Каманда навукоўцаў, якая прыбыла на Самоа, мела надзею ўбачыць гэтага невялікага, даўжынёй каля 30 см і з незвычайнай для галубіных дзюбай (наддзюб'е масіўнае і загнутае на канцы, а паддзюб'е мае два завостраныя і зубападобныя выступы, якія заходзяць на наддзюб'е) у лясах на высакагор'ях.

На жаль, даследчыкі не адзначылі нават слядоў гэтых птушак на гары Silisili, дзе лясы знаходзяцца амаль у некранутым стане. Гэта стала вялікім расчараваннем, бо дагэтуль лічылася, што першабытныя высакагорныя лясы ў гэтай мясцовасці падтрымліваюць як мінімум невялікую папуляцыю гэтых галубоў. Агульная колькасць віду ацэньвалася ў прыкладна 250 птушак, аднак цяпер выглядае, што яна можа быць значна меншаю, калі від яшчэ ўвогуле існуе.

Вельмі хуткае знікненне віду, колькасць якога яшчэ напрыканцы 1980-х гадоў магла налічваць нават 4800 птушак, адбылося з-за слаба кантраляванай і маштабнай высечкі лясоў пад сельскагаспадарчыя палеткі. Становішча значна пагоршылася ў выніку некалькіх моцных трапічных цыклонаў, і ў выніку плошча першабытных лясоў на востраве зменшылася на 75 %. Да гэтага дадалося распаўсюджанне дрэваў-інтрадуцэнтаў і нерэгулюемы выпас жывёлы.



Зубадзюбы голуб з Самоа, нікабарскі *(Caloenas nicobarica)* і віктарыянскі венцэносны галубы *(Goura victoria)* разам з найбольш блізкімі да іх і зніклымі дронтам додо і дронтам з вострава Радрыгес *(Pezophaps solitaria)* утвараюць асобную і ўнікальную галіну атраду Галубепадобных, прадстаўнікі якой утварыліся і былі распаўсюджаныя толькі на асобных астравах.

Тэрмінова распрацаваны і прыняты план па вяртанні віду дае надзею на тое, што від яшчэ будзе аднойдзены. Аднак шанцы на гэта вельмі невялікія.

Малюнак з www.international-dovesociety.com (злева маладая, справа - дарослая птушка)

Новы від птушак апісаны ў Перу



Рэгіён усходніх Андаў у Перу «падарыў» навукоўцам новы від кабезона з роду *Capito*, які названы кабезон Сіра *C. fitzpatricki*.

Новы від быў адкрыты падчас групавога даследавання паўднёвай часткі рэгіёну Cerros del Sira, дзе экспедыцыя шукала месца для летніка ў пойме ракі Rio Tzipani. Майкл Джы Гарвэй (Michael G. Harvey) першым адзначыў невядомы від кабезона яшчэ 8 кастрычніка 2008 года, калі ўбачыў яго ў змешанай чарадзе птушак разам з пурпуровастужкавымі кабезонамі C. wallacei ў горным лесе.

На працягу наступнага тыдня каманда даследчыкаў знайшла таксама невядомы від і ў іншых месцах недалёка ад першага. Было здабыта 8 птушак, з якіх былі падрыхтаваныя скуркі, якія захоўвалі ў эталоне. Акрамя гэтага, атрымалася зрабіць шматлікія экалагічныя і эталагічныя назіранні.

Агульны арэал новага віду ацэньваецца прыкладна ў 300 кв км, часткова ён насяляе рэзерват Sira Communal Reserve, аднак павелічэнне навокал капальняў і нарыхтоўкі леса змушае прызнаць яго статус пагражаемым.

Цікава, што сваю навуковую назву новаапісаны від атрымаў у гонар не толькі яшчэ жывога, але і актыўна працуючага арнітолага д-ра Джона Фіцпэтрыка (John W. Fitzpatrick), які з 1995 года ўзначальвае лабараторыю арніталогіі ў Карнельскім універсітэце (ЗША). Ён апублікаваў шмат артыкулаў па птушках неатропікаў, між іншым быў адным з аўтараў кнігі Neotropical Birds: Ecology and Conservation і апісаў там 7 новых відаў.

З’явіўся першы чалавек, які бачыў больш за 9000 відаў птушак!

19 жніўня ў Інданезіі адбылася гістарычная падзея: сусветны лідар бёдучараў Том Галік (Tom Gullick) адзначыў там свой 9-цітысячны від птушак – садавінную туркаўку Ўолеса Wallace’s Fruit-Dove *Ptilinopus wallacii*. Гэты эндэмічны від ён убачыў і занёс у свой жыццёвы Спіс на востраве Yamdena (астравы Tanimbar).

Дзякуючы адмысловаму туру, які для яго арганізавала кампанія Birdtour Asia, Том мае цяпер у сваім Спісе ўжо 9.047 відаў, пасля наведвання вострава Seram і адзначэння там большасці мясцовых эндэмікаў, уключна з надзвычай рэдкім у прыродзе пурпуровапатылічным лоры Purple-naped Lory *Lorius domicella*.

Том Галік паходзіць з Вялікабрытаніі, але апошнім часам жыве ў Гішпаніі. Лідарам сярод бёдучараў па колькасці адзначаных відаў птушак ён стаў у 2008 годзе. Паводле справаздачы American Birding Association Big Day and ABA List Report, апублікаванай у ліпені, на канец 2011 года ён меў у сваім Спісе 8.942 відаў – на 117 відаў больш, чым у яго бліжэйшага суперніка з Вялікабрытаніі Джона Хорнбакла (Jon Hornbuckle).



Акрамя сусветнага Спісу, Том застаецца таксама лідарам па колькасці адзначаных відаў птушак у Паўднёвай Амерыцы (2.939 відаў) і Афрыцы (2.081). Аднак Спіс птушак Амерыканскай бёдучарскай асацыяцыі ABA заснаваны на таксанамічнай сістэме Клемента Clements taxonomy, якая на канец мінулага года прызнавала 10.700 відаў птушак на Зямлі. Для параўнання, сусветны Спіс птушак глабальнай асацыяцыі BirdLife International на гэты ж час налічвае «толькі» 10.064 віды птушак, якія існуюць на нашай планеце.

Крылы дыназаўраў узніклі для шлюбных паказаў

Апошнія даследаванні паказалі, што крылы ў дыназаўраў не толькі ўзніклі раней, чым лічылася, але і мелі іншую функцыю, чым у птушак – яны выкарыстоўваліся падчас шлюбных гульняў.

Артыкул, апублікаваны ў часопісе Science, апісвае тры знаходкі дыназаўраў з групы *Ornithomimosaur*, зробленыя ў Канадзе.

Група *Ornithomimids* (з лаціны – «тыя, што мімікрыруюць пад птушак») – вельмі падобныя да сучасных страўсаў дыназаўры, якія мелі бяззубую дзюбу, вялікія вочы і доўгія ногі, аднак яшчэ ў іх быў доўгі і тоўсты хвост.

Тым не менш, новыя выкапневыя дыназаўры паходзяць з даволі аддаленай галіны дрэва дыназаўраў, чым аперанныя дыназаўры, вядомыя дагэтуль.

«Дыназаўры з крыламі, знойдзеныя раней у Кітаі, значна бліжэйшыя да птушак», – паведаміла Дэрла Зеленіцкі (Darla Zelenitsky) з універсітэта Кэлгэры (Канада). «Знойдзеныя намі дыназаўры больш прымітыўныя і аддаленыя ад продкаў птушак. Гэта паказвае, што крылы ўзніклі раней, чым мы думалі дагэтуль».

Аднак найбольш цікавым адкрыццём стала не гэта, а тое, што толькі ў дарослага асобніка ёсць pennibrachium – структура, падобная на крыло (хаця і маладыя, і дарослыя дыназаўры паказалі апераналасць практычна ўсяго цела мяккімі, пухападобнымі пёрамі). У дадатак, гэтыя крылы пакрытыя нашмат даўжэйшымі пёрамі, чым цела.

«Наяўнасць прымітыўных крылаў у параўнальна вялікіх дыназаўраў даказвае, што крылы ўзніклі не для палёту, а іх развіццё толькі ў дарослых асобін сведчыць пра тое, што яны былі патрэбныя ў дарослым жыцці – магчыма, для ўдзелу ў шлюбных гульнях», – паведаміла д-р Зеленіцкі.

Новыя знаходкі дапамогуць даць больш дэталёвы адказ на пытанні: калі і для чаго ўзніклі пёры.



Падрыхтаваў Дзьмітры Вінчэўскі паводле навін з сайта www.birdwatch.by

Як я птушкам дапамагаў


Вялікая сініца

Сяргей Зуёнак. Фота Андрэя Несцерава


Таўстадзюб


Палявы і дамовы вераб'і

Ужо колькі гадоў кармлю птушак на балконе. Яно па цяперашніх зімах, калі разабрацца, і не вельмі птушкам патрэбна: на тыдзень адлігі два дні ўмоўных маразоў прыпадае, снег то ляжа, то сыдзе – карацей, раздолле птушкам. Што тут разважаць, калі нават найбольш смелыя шпакі ад далёкага выраю адмовіліся, застаюцца зімаваць у Мінску, сядзяць на голых галінках і выводзяць свае задумлівыя рулады проста сярод шэрай зімовай распуціцы. Раздолле-раздоллем, але ад дармавога пачастунка ніхто ніколі не адмаўляўся – што ў нас, у людзей, што ў птушак. Вось і раблю кожную зіму ў пачатку снежня імправізаваную сталоўку з двухлітровай бутэлькі: выразаў збоку акенца, прымайстраваў да балконных парэнчаў, насыпаў сланечніку – налятай, пярнатае братэрства!

Вось так мы і зімуем – птушкам радасна, а мне цікава. Толькі вось мінулая зіма выдалася зусім непадобная да іншых: на самыя Каляды слупок тэрмометра ўпэўнена апусціўся ніжэй рысачкі -20 і застыў там ажно на два тыдні, быццам прымарожаны. З гэтае нагоды, пакідаўшы ўсе свае справы, я некалькі разоў адмыслова ездзіў на Камароўку: расход насення на працягу марозных тыдняў павялічыўся шматкроць, дарэчы, і кошт сланечніка таксама ўзрос. Цёткі-прадаўшчыцы, да самага носу захутаныя ў цёплыя пуховыя хусткі, паяснялі гэта тым, што з пахаладаннем усё «кармавое» насенне размялі аматары птушак, таму даводзіцца прадаваць адборны, «людскі» сланечнік, праўда крыху танней, чым ён увогуле каштуе.

Дзіўна было даведацца, што асноўнымі яго пакупнікамі з'яўляюцца бабулькі-пенсіянеркі – і сапраўды, відаць, узрос наш дабрабыт, калі гэтая самая «забяспечаная» частка насельніцтва змагла дзяліцца сваім жабрацкім прыбыткам з сінічкамі. У самы моцны мароз адна з такіх старэнькіх пакупніц паскардзілася мне: «А мае птушкі нешта не прылятаюць, пэўна, лётаць халодна, схаваліся недзе і сядзяць». Падумаў я і згадзіўся з бабулькай, не стаў тлумачыць ёй, чаму сінічкі лётаць перасталі... Дарэчы, у гэты ж час побач з «птушынымі» прылаўкамі апранутыя ў модныя футры кабеты памаладзей набывалі заморскую садавіну і іншыя дарагія прысмакі – пэўна, не ведалі дакладна, што менавіта патрабуецца птушкам узімку.

Вельмі прыемна было атрымаць ад цётак-прадаўшчыц бонус да пакупкі – закладачку-вызначальнік вытворчасці АПБ – гэта на той выпадак, калі я не ведаю дакладна, хто прылятае ў маю сталоўку. Для замацавання арніталагічных ведаў пакупнікоў на сцяне за прылаўкамі быў прымацаваны яшчэ і вялікі каляровы постэр ад таго ж вытворцы. Пры дапамозе гэтай нагляднасці, атаварыўшы мяне, цёткі наперабой пачалі тлумачыць, як вызначаць розныя віды вераб'ёў, якія круціліся тут жа на прылаўку і спрытна выхопвалі сланечнік ці не з рук прадаўшчыц. Я падзякаваў за навуку, паабяцаў кабетам, што яшчэ дасканала сам ва ўсім разбяруся і заспяшаўся дадому: мае ж «кватыранты» таксама галодныя.

З дапамогай закладачкі пакрысе ўсіх дакладна вызначыў, вось мой спіс наведвальнікаў: два віды вераб'ёў (самі ведаеце, якіх), два віды сініц (таксама здагадваецеся), зелянушкі, таўстадзюбы (ніколі раней столькі не бачыў), часам шызыя галубы і каўкі.

На першы погляд здаецца, што асноўныя сярод наведвальнікаў сініцы – мітусяцца, дэманструюць адна другой, якія яны «жудасныя», хапаюць зернейка, хуценька апрацоўваюць яго на суседняй бярэзіне, а потым зноў да бутэлькі: зімовы дзень кароткі, а ноч доўгая, трэба так наесціся, каб хапіла да раніцы. Справа кардынальна мянялася, калі ў сталоўцы з'яўляліся вераб'і альбо зелянушкі. Яны вырашалі гэтае пытанне па-свойму, а менавіта цалкам залазілі у бутэльку і, нікога больш туды не пускаючы, спрытна лузгалі сланечнік, пакуль не наядаліся «ад пуза», а толькі потым задаволена адляталі на тую ж самую бярэзіну. І толькі калі прылятлі таўстадзюбы, я разумеў, хто тут сапраўдны гаспадар.

Бліжэй да вясны мой seen-list папоўніўся яшчэ адным відам – шуляк-карагольчык (гэты на закладачцы намаляваны не быў, але я і сам яго ведаю). Таксама прыляцеў, таксама падсілкаваўся. А што рабіць, ён таксама есці хоча. Як бы сказаў незабыўны Дзерсу-Узала: «Шуляк-карагольчык – таксама людзі»...

... А вось аднойчы, спяшаючыся на чарговы «ланч», не ўпісаўся небарака ў віраж – з разгону бразнуўся ў шыбу. Але нічога, паляжаў крыху, потым на парэнчах пасядзеў і паляцеў сабе, пэўна, стратэгію палявання абдумваць і тактыку карэктаваць...

Пераможцы фотаконкурсу «Птушкі ў аб'ектыве - 2012»
Намінацыя «Птушкі»



Мікалай Верабей «Будаўнікі» – 1 месца



Мікалай Гулінскі «Водныя баталіі» – 2 месца

Здымкі – прызёры фотаконкурсу і не толькі можна знайсці ў Галерэі на www.birdwatch.by

Работы пераможцаў конкурса дзіцячага малюнка «Чорны свіргуль – птушка 2012 года»



1 месца. «Фантазія». Цыплак Святлана, 14 год, в. Валокі, Барысаўскі р-н.



2 месца. «Чорны свіргуль». Тарасевіч Марыя, 11 год, г. Барысаў.



2 месца. «Нястомны лятун». Літвін Насця, 8 год, г. Мінск.



3 месца. «Добрыя бацькі – чорныя свіргулі». Голубева Вольга, 9 год, г. Мінск.